# ПРАВАПІС Е, Ё – Я
# Ў ПРОСТЫХ СЛОВАХ

# Літара ё пішацца:

**Толькі пад націскам** **:** цёплы, вёска.

**Выключэнні: ётаваны, ётацыя, ёдапірын.**

# <u>Літара е пішацца</u>:

- пад націскам: цесна, землі;
- ва ўсіх складах, акрамя першага перад націскам: зеленаваты, леснікі;
- у першым складзе перад націскам у неславянскіх запазычаннях: мелодыя, кефір, балерына;
- у спалучэннях *ге, ке, хе:* генерал, кераміка, Хеопс;
- у часціцы ***не*** і прыназоўніку ***без:*** без нас, не быў.

# <u>Літара я пішацца</u>:

- у першым складзе перад націскам у славянскіх словах: лягчэйшы, вятры, <u>дзявяты, дзясяты, сямнаццаць, васямнаццаць;</u>
- у першым складзе перад націскам у даўно запазычаных неславянскіх словах: дзяжурны, яфрэйтар, сяржант, каляндар.

# ПРАВАПІС ГАЛОСНЫХ

у складаных словах

# Правапіс галосных у складаных словах

**<u>Літара о/ё ў першай частцы складанага слова пішацца</u>**:

- калі націск прыпадае не на першы склад другой часткі: водалячэбніца;
- у словах з другой часткай *–знаўства, -знавец, -вед*: мовазнаўства, мовавед;
- незалежна ад націску ў другой частцы, калі яна пачынаецца з *<u>ў</u>* : вогнеўстойлівы, збожжаўборка;
- у словах, дзе магчыма двухсэнсоўнасць значэння: словаформа, работадавец.

## Літара о/ё пішацца ў словах з першай часткай:

- **аснова:** асноватворны;
- **вока:** вокамгненны;
- **грос:** гросмайстар,
- **збожжа:** збожжасклад;
- **колера:** колераадчуванне;
- **контр:** контргульня, контрмера;
- **множна:** множналікавы;
- **мова:** мовабудова;
- **мота:** мотакрос (выключэнні: матацыкл, матавоз);
- **моцна:** моцнадзейны;
- **проці:** проціпеглы;
- **ружова:** ружоващокі;
- **свабода:** свабодамысны;
- **свое:** своечасовы, своеасаблівы;
- **слова:** словаўжыванне;
- **радые**: радыеантэна;
- **фонда:** фондасховішча;
- **фота:** фотаздымак (выключэнне: фатаграфія);
- **што:** штогоднік, штораз, штогод;

- **Літара *е* ў першай частцы складанага слова захоўваецца незалежна ад націску:** свежавымыты, белабрысы.

Выключэнне: ***велік-/вялік-*** *пішацца ў адпаведнасці з агульным правілам*: **велікадушны, вялікадзяржаўны.**

- **Літара *э* захоўваецца ў першай частцы складаных слоў заўсёды, за выключэннем лічэбнікаў:** сэрцападобны, шэравокі**.**
- **Лічэбнікі, выступаючы першай часткай складаных слоў, захоўваюць свае склонавыя формы: сямібальны.**